**УДК 930.001.5**

# РАЗВІЦЦЁ ШЛЯХЕЦКАГА САМАКІРАВАННЯ І СТАНАЎЛЕННЕ ГАСПАДАРЧАГА СОЙМІКА Ў ВКЛ У КАНЦЫ XVII СТ. – ПАЧАТКУ XVIII СТ.

***А. У. МАЦУК***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*На падставе новых рукапісных дакументаў даследуецца развіццё шляхецкага самакіравання і станаўленне гаспадарчага сойміка ў канцы XVII ст. – пачатку XVIII ст. у розных паветах ВКЛ. Удалося ўстанавіць, што сваім з'яўленню гаспадарчы соймік абавязаны руху "рэспубліканцаў", які адным з пунктаў сваёй праграмы "ўраўнавання правоў" (каэквацыі) бачыў увядзення скарбовых судоў і перанясенне фінансавання войска ў паветы. На гаспадарчым сойміку меў адбывацца выбар: паборцаў чопавага і шэлезнага, гіберны, габрэйскага і татарскага пагалоўнага, тытунёвай манаполіі, камісараў па зборы падаткаў, а таксама павятовых палкоўніка і ротмістраў, складу скарбовага (фіскальнага) суда.*

***Ключавыя словы:*** *гаспадарчы соймік, каэквацыя, рэспубліканцы, шляхта, магнаты, паборцы, скарбовы суд, парламентарызм.*

**Уводзіны.** Згодна пастановам "ураўнавання правоў" (каэквацыі) 1697 г. уводзіўся новы соймік для ВКЛ – гаспадарчы. Яго паходжанне звязана з эканамічна-самакіроўчымі ініцыятывамі шляхты ў рамках свайго павета, адною з формаў выяўлення якіх былі напачатку прыманыя на сойміках рэзалюцыі адносна, галоўным чынам, падаткаў і бяспекі. Гаспадарчы соймік прымаў пастановы па справах павета, размеркаванні падаткаў, ухваленых соймам, выбіраў падатковых паборцаў і кантраляваў іх дзейнасць, вызначаў ваяводскія падаткі, прымаў рашэнні пра выдаткі з ваяводскага скарбу, ухваляў вярбоўку павятовых жаўнераў і вызначаў іх начальнікаў [1, с. 617]. Гаспадарчы соймік значна пашыраў правы шляхты ў сферы самакіравання. Як заўважае Анджэй Рахуба гаспадарчы соймік быў уведзены ў ВКЛ у 1698 г. на моцы пастановы аб каэквацыі, а збіраўся ён назаўтра пасля грамнічнага [2, с. 228–230]. Упершыню Генеральная пастанова шляхты ВКЛ паміж Лаўнам і Пузевічамі 21 снежня 1698 г. сярод іншага вызначыла тэрмін і кампетэнцыю гаспадарчага сойміка ў ВКЛ (працэдуру збору падаткаў і абрання адказных за гэта асоб) [3, p. 142–179]. Паводле гэтай пастановы ўсе справы, звязаныя з падаткамі, адносіліся цяпер да кампетэнцыі грамнічнага сойміка. Згодна яе: "Адразу ж на сойміку, які мае адбыцца неўзабаве [грамнічным], пасля абрання дэпутатаў і вырашэння справаў, звязаных з ганьбаю, іх міласці панове грамадзяне ВКЛ у сваіх ваяводствах і паветах маюць учыніць сабе парадак – згодна з законам каэквацыі – абіраць новых суддзяў скарбовага трыбунала, таксама паборцаў падаткаў – гіберны, чопавага, шэлезнага, тытунёвай манаполіі, пагалоўнага габрэйскага і татарскага – будуць абіраць сабе ротмістраў і падзеляць паміж імі парафіі, каб праз іх выкананне трыбунальскіх скарбовых дэкрэтаў ішло з большым плёнам, і плату ротмістру абмяркуюць, каб дарма не працаваў – на тым жа сойміку ранейшых паборцаў заслухоўваць і рашэнні па дыспенсаваным падаткам Рэчы Паспалітай прымаць будуць і ўсё, што тычыцца парадку і платы войска, усё гэта на тым з'ездзе маюць вырашаць" [2, с. 230]. Больш таго на гэтым сойміку шляхта мела "абраць камісара з немалымі спадчыннымі маёнткамі – аднаго або двух, каму паборцы ўсіх падаткаў будуць уносіць сумы, ад якіх будуць забіраць грошы ўсе дэпутаты ад харугвы. Той жа камісар або два маюць рабіць справаздачу, здаючы сваё чопавае і шэлезнае камісарства ў ваяводствах і паветах" [2, с. 230]. Нягледзячы на тое, што гэтая пастанова не была зацверджана соймам, менавіта яна становіцца ўзорам для рэалізацыі каэквацыі на практыцы.

У сваю чаргу акт "ураўнавання правоў" (каэквацыі) 1697 г. ніяк не рэгламентаваў гэтае пытанне. У ім знаходзім толькі ўзгадку пра павятовыя скарбовыя суды, якія "па ваяводствам і паветах маюць судзіць згодна парадку Польскай Кароны" [4, s. 867]. Гэта паўтаралася ў пастановах сойма 1699 г. [5, s. 75–76]. Галоўнай мэтай "рэспубліканцаў" такімі дзеяннямі па ўніфікацыі скарбовай сістэмы Кароны і Княства было паменшыць уплывы магнатаў. Увядзеннне гаспадарчага сойміка і аддача пад яго ўладу новастворанных скарбовых судоў павялічвала ўплывы шляхты за кошт магнатаў, якія займалі ўрад падскарбія і мелі моцныя ўплывы ў Скарбовым Трыбунале [6, s. 197–198]. Фактычна акт "ураўнавання правоў" (каэквацыя) і Генеральная пастанова шляхты ВКЛ ад 21 снежня 1698 г. і складаюць заканадаўчую аснову для гаспадарчага сойміка, які павінен быў адбывацца ў Княстве на другі дзень пасля грамнічнага. Часам размежаванне паміж грамнічным і гаспадарчым соймікамі адсутнічае і абодва соймікі выступаюць пад агульнай назвай ("грамнічны"), часта соймік фігуруе ўвогуле без назвы. Пры гэтым даследчык лічыць прававой нормай у дадзеным выпадку каронныя ўзоры, а менавіта, канстытуцыю сойма 1685 г., якая вызначала наступны пасля грамнічнага сойміка дзень для правядзення сойміка гаспадарчага [7, s. 179]. Пасля ажыццяўлення "ўраўнавання правоў" (каэквацыі) такая практыка павінна была аўтаматычна замацавацца і ў ВКЛ. Мэтай гэтага артыкула з'яўляецца даследванне развіцця шляхецкага самакіравання і станаўлення гаспадарчага сойміка ў канцы XVII ст. – пачатку XVIII ст.

**Асноўная частка.** На першых, пасля прыняцця каэквацыі, грамнічных сойміках у 1698 г. толькі ў некаторых паветах былі спробы ўвесці гаспадарчыя соймікі. У Вільне, напрыклад, скарбовыя суддзі, паборцы падаткаў і камісары былі абраныя на грамнічным сойміку 3 лютага 1698 г., пасля прызнання каэквацыі вялікім гетманам ВКЛ, Казімірам Янам Сапегам, што фактычна азначала прызнанне каэквацыі ўсёй магнацкай групоўкай Сапегаў. Выконваючым абавязкі харужага замест віленскага падстолія і падваяводы Міхала Шумскага быў абраны ковенскі маршалковіч Ян Скарульскі. Ротмістрамі былі абраны Ян Скарульскі, Мальхер Пяткевіч, Ян Крыштаф Жаба і віленскі харужыч Ян Хаецкі. Ротмістрам над татарамі стаў рэчыцкі скарбнік Уладзіслаў Красоўскі. Адміністратарамі чопавага і шэлезнага, а таксама тытунёвай манаполіі былі абраны Якуб Пяткевіч і Уладзіслаў Красоўскі. Паборцамі габрэйскага і татарскага пагалоўнага былі абраны рэчыцкі падчашы Самуэль Манкевіч і Станіслаў Жухоўскі, а гіберны – Мальхер Пяткевіч і Ян Крыштаф Жаба. Падаткі мелі выплачвацца паборцамі харугвам на падставе асігнацый гетманаў. Было абрана 10 скарбовых суддзяў, сярод якіх і ўраднікі земскага суда [8, k. 29 – 20; 9, c. 86]. Як бачым, на віленскім сойміку не было абрана камісараў, якія згодна каэквацыі мелі збіраць усе падаткі ад паборцаў і аддаваць войску. Магчыма, што пад імі разумеліся паборцы гіберны, названыя ў пастанове камісарамі, альбо так было зроблена па ініцыятыве Сапегаў.

У той жа час, нічога не вядома пра правядзенне гаспадарчага сойміка ў размешчаных побач з Вільняй Ашмянах. Тут, на грамнічным сойміку 3 лютага 1698 г., былі абраны дэпутаты на Трыбунал ВКЛ, а назаўтра, 4 лютага 1698 г., адбыўся соймік прызначаны пастановай ашмянскага рэляцыйнага сойміка і дэкрэтам скарбовага суда ў пытанні запазычанасці па падатках. Было вырашана правесці эгзэкуцыю падаткаў з дапамогай узначаленых ротмістрамі атрадаў. Збор быў прызначаны на 25 лютага 1698 г. На сойміку перамаглі прыхільнікі “рэспубліканцаў” і таму на ім адсутнічаў прыхільнік Сапегаў, ашмянскі харужы Станіслаў Пазняк. Нягледзячы на гэта патрабавалася, каб Станіслаў Пазняк, згодна прэрагатыў свайго ўраду, прыбыў з харугвай на гэты з’езд [9, c. 86–87; 10, s. 126]. Хутчэй за ўсё, і тут адбыўся не толькі грамнічны, а і гаспадарчы соймік, бо ў Ашмянах перамаглі “рэспубліканцы”. Як вядома, яны выступалі за ўвядзенне “каэквацыі”, а гаспадарчы соймік быў адным з галоўных яе элементаў.

У Вількаміры 3 лютага 1698 г. прайшоў дэпутацкі соймік, а на другі дзень – рэляцыйны соймік, дзе сваю рэляцыю склалі паслы з сойма. Соймікавым дырэктарам быў абраны вількамірскі гродскі староста і мінскі ваявода Міхал Сясіцкі. У першы дзень былі абраны дэпутаты на Трыбунал ВКЛ, а назаўтра заслухалі справаздачы паслоў і была прынята пастанова, якая датычылася гаспадарчага сойміка. Хоць гэты соймік быў названы рэляцыйным. Вількамірскім палкоўнікам быў абраны соймікавы дырэктар, вышэйзгаданы Міхал Сясіцкі, якому было даручана прызначыць адміністратара падаткаў на аплату войска. Ротмістрамі былі абраны вількамірскі земскі суддзя Андрэй Шырвіньскі, вількамірскі стольнік Юзаф Азямблоўскі, вількамірскі падчашы Канстанцін Падлецкі, вількамірскі стражнік Юрый Касцялкоўскі, вількамірскі харужыч Крыштаф Сясіцкі і вількамірскі падкаморыч Станіслаў Белазор. Акрамя таго былі абраны скарбовыя суддзі “згодна з духам новага закону каэквацыі і канстытуцыі каранацыйнага сойма, якая хоча, каб па ваяводствах і паветах з’явіліся скарбовыя, або фіскальныя, суды”. Было абрана 6 суддзяў пры земскіх і гродскіх ураднiках. Кіраваць гэтым судом абралі вышэйзгаданага Міхала Сясіцкага. Паборцамі гіберны былі абраны вількамірскі будаўнічы Францішак Ямант і мінскі стольнік Мікалай Касцялкоўскі. На гэтым жа сойміку былі вызначаны адміністратар чопавага, шэлезнага, тытунёвай манаполіі і габрэйскага пагалоўнага, якім стаў троцкі скарбнік Рафал Ішора. Прычым апошні быў вызначаны соймікавым дырэктарам. Узнагароджанне паборцам вызначалася “згодна старадаўнім звычаям” па адным грошы ад кожнага сабранага злотага [2, c. 229; 9, c. 87–88; 11, p. 28–31v, 32–33v, 35–37v].

Як бачна, у Вількаміры гаспадарчы соймік меў пэўныя адрозенні ў тым, што фактычна быў спалучаны з рэляцыйным соймікам. Аднак, што асабліва важна, частка рашэнняў па абранню паборцаў падаткаў і складу скарбовага суда адбылася на наступны дзень. Цікавай практыкай было і вызначэнне адміністратара чопавага, шэлезнага, тытунёвай манаполіі і габрэйскага пагалоўнага не самім соймікам, а дэлегаванне гэтага права соймікаваму дырэктару, вількамірскаму гродскаму старосце і мінскаму ваяводзе Міхалу Сясіцкаму.

У Троках абранне скарбовых суддзяў, адміністратараў падаткаў (гіберны, чопавага і шэлезнага) вядома толькі з 1699 г., калі грамнічны соймік склікаўся не толькі як грамнічны, але і для “іншых пасяджэнняў”. Пасля выбару дэпутатаў на Трыбунал ВКЛ троцкая шляхта прыступіла да разгляду пытанняў, якія датычыліся прэрагатыў гаспадарчага сойміка. Адміністратарамі чопавага і шэлезнага абралі троцкага падстолія Андрэя Турлая і віцебскага падчашага Канстанціна Укольскага. Паборцамі гіберны былі абраны Кароль Таруса, троцкі гараднічы Ян Івашкевіч, троцкі чашнік Рафал Войдаг, троцкі канюшы Юрый Танскі і Самуэль Войзбун. Узнагароджанне ім вызначалася па адным грошу з кожнага сабранага злотага. Гэты падатак меў збірацца паводле апошняй абюраты 1690 г. Таксама былі абраны паборцы габрэйскага і татарскага пагалоўнага (хто канкрэтна – нажаль невядома з-за пашкоджання соймікавай пастановы). Камісарамі былі абраны троцкі цівун і троцкі земскі пісар Міхал Ян Шчука і троцкі падкаморы Ян Уладзіслаў Укольскі. Было абрана 6 скарбовых суддзяў, якія разам з судовымі і несудовымі земскімі і гродскімі ўраднікамі сфармавалі склад скарбовага суда [7, s. 179; 12, c. 172; 13, p. 1255–1256].

У Гародні ў 1698 г. адбыўся падзел грамнічнага сойміка на два альтэрнатыўных сойміка. Прыхільнікі Сапегаў сабраліся на замку, а прыхільнікі "рэспубліканцаў" – у кляштары францышканцаў, за Нёманам. На абодвух сойміках былі абраны дэпутаты на Трыбунал ВКЛ і паслы да караля Аўгуста ІІ. Дакладна вядома толькі, што "рэспубліканцы" правялі і гаспадарчы соймік. Адміністратарам чопавага і шэлезнага быў абраны Ян Масальскі. Паборцамі гіберны сталі полацкі падстолі Міхал Жывульт і вількамірскі чашнік Траян Львовіч. Паборцам татарскага і габрэйскага пагалоўнага былі абраны Станіслаў Кміта і Юзаф Пачобут. Камісарам на гэтым жа сойміку стаў інстыгатар ВКЛ і гарадзенскі войскі Станіслаў Рукевіч [9, с. 88–89; 14, с. 203]. Магчыма, што зрабілі так і на сойміку прыхільнікаў Сапегаў. На карысць гэтага кажа сітуацыя ў наступным 1699 годзе, калі зноў дайшло да падзелу грамнічнага сойміка і правядзення двух альтэрнатыўных. Тады і прыхільнікі "рэспубліканцаў" і прыхільнікі Сапегаў абралі скарбовых суддзяў, павятовых ротмістраў і паборцаў падаткаў [12, с. 173; 14, с. 205–206].

На ковенскім дэпутацкім сойміку 1698 г. соймікавым дырэктарам быў абраны прыхільнік Сапегаў, ковенскі земскі суддзя, Адам Прозар, а пад яго кіраўніцтвам адбыўся выбар дэпутатаў на Трыбунал ВКЛ. Перавагу атрымалі прыхільнікі Сапегаў, але яны не перашкаджалі ўвядзенню "згодна каэквацыі" гаспадарчага сойміка. Камісарамі былі абраны ковенскі харужы Мікалай Корф і ковенскі земскі суддзя Адам Прозар. Адміністратарамі чопавага і шэлезнага сталі ковенскі падкаморы Мікалай Забела і ковенскі земскі пісар Ян Прозар. Паборцамі гіберны былі абраны два Шымона Забелы. Першы з іх быў ковенскім падсудкам, а другі – ковенскім падчашым. Паборцамі татарскага і габрэйскага пагалоўнага, а таксама тытунёвай манаполіі былі абраны ковенскі мечнік Караль Прозар і брэсцкі стольнік Аляксандр Мядэкша [9, с. 89–90].

На полацкім грамнічным сойміку 1698 г. перамаглі "рэспубліканцы". Былі абраны дэпутаты на Трыбунал ВКЛ і камісар для перамоў з войскам аб прычыненых шкодах (полацкі падкаморы Януш Зяновіч). Як устанавіў Зміцер Віцько, не забылася полацкая шляхта і пра пытанні, якія належалі да кампетэнцыі гаспадарчага сойміка. Паборцамі гіберны былі абраны Юзаф Корсак Удзельскі і Аляксандр Рыпінскі. Дакладна быў абраны скарбовы суд на чале з полацкім земскім суддзёй Самуэлем Пжысецкім. Былі абраны адміністратары чопавага і шэлезнага. Імі сталі (хоць, магчыма, гэта былі адміністратары з 1699 г.) полацкі стольнік Ян Пакаш і полацкі земскі пісар Даміян Рыпінскі. Верагодна тады ж паборцам габрэйскага пагалоўнага стаў Уладзіслаў Баратынскі (хоць магчыма быў ім у 1699 г.) [9, с. 90–91; 15, с. 23–24].

У Мінску грамнічны соймік 1698 г. працягваўся 4 дні. Былі абраны дэпутаты на Трыбунал ВКЛ. Камісарамі для перамоў з войскам былі абраны мінскі войскі Пётр Пратасовіч і Цадроўскі. Мінская шляхта разглядзела не толькі палітычныя пытанні, але і гаспадарчыя (хутчэй усяго на гаспадарчым сойміку). Зміцер Віцько ўстанавіў абраных на гэтым сойміку ўраднікаў на падставе розных дакументаў. Адміністратарамі чопавага і шэлезнага на 2 гады былі абраны мінскі чашнік Ян Матушэвіч і смаленскі мечнік Крыштаф Мацкевіч. Паборцамі гіберны, татарскага і габрэйскага пагалоўнага сталі мінскі лоўчы Рыгор Няміра і мінскі канюшы Станіслаў Гудзяеўскі. Абраны былі ротмістры па парафіях. Цікавым было іншае – было вырашана, каб заставаўся дзейнічаць скарбовы суд, які быў абраны яшчэ на рэляцыйным сойміку паслоў з элекцыйнага сойма 1697 г. [9, с. 93; 12, с. 187–188].

У некаторых паветах з'яўленне гаспадарчых соймікаў адбылося са спазненнем. Брэсцкая шляхта сабралася на соймік з адкладу 2 верасня 1698 г. згодна пастановам каэквацыі і каранацыйнага сойма. На гэтым сойміку былі абраны адміністратары для збору падаткаў чопавага і шэлезнага – брэсцкі кашталяніч Станіслаў Русецкі і брэсцкі падстолі Станіслаў Тышкоўскі. За год на войска яны мелі сабраць 25 тысяч злотых, за збор якіх мелі разлічыцца перад скарбовымі судамі. Прычым грошы за 5 месяцаў паборныя мусілі аддаць да наступнага гаспадарчага сойміка. Для збору гіберны былі абраны брэсцкі падстолі Францішак Шуйскі і брэсцкі чашнік Жыгімонт Хшанстоўскі. Габрэйскае і татарскае пагалоўнае абралі збіраць брэсцкаму стражніку Казіміру Непакайчыцкаму і брэсцкаму скарбніку Яну Бухавецкаму. Таксама быў абраны склад скарбовага суда ў колькасці 10 суддзяў [16, арк. 315–318; 17, с. 253–255]. Як бачым, гаспадарчы соймік адбыўся ў Брэсцкім павеце, але не ў вызначаны тэрмін.

Ужо 10 лютага 1699 г., у вызначаны законам тэрмін, брэсцкая шляхта сабралася на наступны падобны соймік "згодна прынятага права каэквацыі", а таксама "на падставе прынятай Генеральнай пастановы ўсіх ваяводстваў ВКЛ у полі быўшых паміж Каменкай і Пузевічамі". На гэтым сойміку паборцы падаткаў склалі справаздачу са сваёй функцыі перад скарбовымі суддзямі. Было прынята рашэнне: каб паборцы гіберны, габрэйскага і татарскага пагалоўнага не рабілі шкодаў ва ўладаннях падаткаплацельшчыкаў, то ўсе хто меў плаціць гэтыя падаткі абавязаны былі іх прывесці да Брэста і аддаць паборцам на працягу 3 тыдняў ад дня Святога Міхала (29 верасня). На тых, хто гэтага не зробіць, то ўжо пасля рашэння скарбовага суда мусіць быць праведзена эгзэкуцыя. Было вырашана, што паборцы падатку тытунёвай манаполіі маюць мець сваіх мясцовых прадстаўнікоў у месцах, дзе ёсць скарбовыя каморы, якія і павінны пільнаваць, каб выплочвалася скарбу мыта па 3 грошы. На ўзнагароджанне паборцам гэтага падатку меў ісці чацвёрты грош гэтага мыта. Мясцовая шляхта ня ведала памераў усіх гэтых падаткаў (габрэйскага і татарскага пагалоўнага, тытунёвай манаполіі) і таму хацела, каб іх паборцы прысягнулі на сабранную суму перад скарбовым судом ці на будучым гаспадарчым сойміку. Для лепшага разумення колькасці сабранных падаткаў было вырашана правесці люстрацыю, а люстратарамі

былі абраны Лукаш Трэмбіцкі і Міхал Касцюшка. Тэрмін ім даваўся ў 11 тыдняў і складзены імі тарыф меў быць зацверджаны на сойміку з адкладу 30 красавіка 1699 г. Для правядзення эгзэкуцыяў і абароны ад "свавольных купаў" быў абраны павятовы палкоўнік, брэсцкі падкаморы, Людвік Пацей, якому вызначаліся за выкананне яго абавязкаў брэсцкі і забужскі тракты. На іншыя тракты былі абраны ротмістры: камянецкі і высоцкі – брэсцкі харужы Дамінік Шуйскі, кобрыньскі і дывінскі – брэсцкі падчашы Бенедыкт Бухавецкі, пружанскі і шэрашоўскі – Ян Бухавецкі, мялейчыцкі – Бранікоўскі. Усе сабраныя падаткі аддаваліся камісарам, якімі былі абраныя брэсцкі падсудак Мікалай Махвіц і аршанскі стольнік Пётр Галінскі. Яны мелі выдаваць грошы толькі на войска на падставе законных асігнацый з пазначэннем скарбовага суда. Разлічыцца яны мусілі перад скарбовым судом. Паборцамі падаткаў абіраліся: гіберны – брэсцкі лоўчы Францішак Хшанстоўскі і Казімір Касцюшка; тытунёвай манаполіі, габрэйскага і татарскага пагалоўнага – брэсцкі земскі рэгент Міхал Непакайчыцкі і Міхал Багуслаўскі. Адначасова адміністратарамі чопавага і шэлезнага заставаліся абраныя на прошлым сойміку, бо былі абраны тэрмінам на год. Таксама заставаўся нязменым склад скарбовага суда, у які ўваходзілі ўраднікі гродскага суда, бо былі абраны на прошлым сойміку на год. Як памятаем, гэта быў соймік 2 верасня 1698 г. і значыцца адміністратары чопавага і шэлезнага, а таксама скарбовы суд меў дзейнічаць да 2 верасня 1699 г. Забаранялася выдаваць грошы на падставе асігнацый віленскага ваяводы і вялікага гетмана ВКЛ Казіміра Яна Сапегі, якія не былі прызнаны ўладамі "рэспубліканцаў", што меў пільнаваць скарбовы суд. Як бачым, новастворанныя органы павінны былі дапамагчы "рэспубліканцам" у іх змаганні з Сапегамі. Адміністратарам чопавага і шэлезнага за 5 месяцаў іх працы згодна прошлай пастановы было сабрана 6 тысяч злотых [12, с. 185–186; 16, арк. 1056–1063; 17, с. 286–290].

Гэты гаспадарчы соймік 1699 г. цікавы яшчэ тым, што згодна Генеральнай пастановы шляхты ВКЛ 1698 г. дзейнічала забарона зрыву сойміка на стадыі разгляду падатковых пытанняў [2, с. 230]. Менавіта таму соймік адбыўся, нягледзячы на тое, што дзень перад гэтым быў сарваны брэсцкі грамнічны соймік [16, арк. 1056–1063; 17, с. 286]. Фактычна аказалася, што гэта ўжо два розныя соймікі, хоць часова і звязаныя паміж сабой. Гаспадарчы соймік аказаўся па-за барацьбой за Трыбунал ВКЛ і адпаведна вакол выбараў на грамнічных сойміках.

У той жа час былі паветы, дзе ўвядзенне гаспадарчага сойміка адбывалася з вялікімі складанасцямі і зацягнулася на некалькі год. У інструкцыі Пінскага павета паслам на сойм 1698 г. заяўлялася, што з-за перашкоды скарбу "паводле каэквацыі надзвычайных падаткаў павет наш яшчэ да гэтага часу не атрымаў у сваё распараджэнне" [18, арк. 256адв; 19, с. 23–24]. Аднак, напэўна, атрымалася перамяніць гэтую сітуацыю. Пінская шляхта 11 жніўня 1698 г. сабралася на свой соймік для слухання рэляцыі пасла на сойм 1698 г. Міхала Вішнявецкага. Акрамя таго, на гэтым сойміку "згодна каэквацыі" абралі паборцамі чопавага, шэлезнага і шосавага троцкага скарбніка Каспера Парысовіча і Юзафа Пласкавіцкага. Прычым яны павінны былі быць гэтымі паборцамі ад 16 жніўня 1698 г. да 14 жніўня 1699 г. Узнагароджанне паборцам вызначалася па тысячы злотых [18, арк. 547–547адв]. У сваю чаргу толькі на наступным пінскім сойміку (элекцыйны 18 – 19 лістапада 1698 г.) быў абраны скарбовы суд, які меў складацца з гродскага суда, і два земскія ўраднікі: пінскі стольнік Лявона Война і пінскі земскі пісар Самуэль Орда [18, арк. 651–652; 19, с. 25].

У наступным, 1699 г. на пінскім грамнічным сойміку было ўжо дакладна вызначанана "колькі і адкуль павінна збірацца чопавага і шэлезнага". Прычым адміністратарамі гэтага падатку былі зацверджаны тыя самыя, што і ў папярэднім 1698 г.: Каспер Парысовіч і Юзаф Пласкавіцкі. Іх выбар адбыўся пад дырэкцыяй Міхала Вішнявецкага і ўжо пасля папярэдня адбыўшагася грамнічнага сойміка, дзе дэпутатамі былі абраны дружылавіцкі староста Міхал Цехановіч і пінскі стольнік Казімір Друцкі Любецкі [12, с. 186–187; 18, арк. 1055–1056; 19, с. 25].

На пінскім грамнічным сойміку 1700 г. асудзілі дзейнасць Скарбовага Трыбунала ВКЛ 1700 г. і падтрымалі дзейнасць свайго дэпутата, які не ўвайшоў у лік суддзяў на ім. Павятовым палкоўнікам быў абраны Януш Вішнявецкі, які меў права сваімі ўніверсаламі па парафіях склікаць паспалітае рушанне. Калі будуць якія перашкоды для кіравання Януша Вішнявецкага, то тады замест яго палкоўнікам меў стаць яго брат Міхал. Мясцовая шляхта хацела, каб пяхота войска ВКЛ пакінула месца сваёй дыслакацыі ў Пінскім павеце, у праціўным выпадку патрабавала ад палкоўніка накіравацца на яе паспалітым рушаннем [19, с. 26; 20, арк. 288–289адв]. Як бачым, ніякіх пастаноў, якія датычыліся абрання паборцаў ці скарбовага суда, ад пінскага гаспадарчага сойміка 1700 г. не дайшло. Амаль усе пастановы гэтага сойміка датычыліся цякучай палітычнай сітуацыі. Магчыма ўплыў на гэтае мела тое, што пінскі соймік у гэты час знаходзіўся пад уплывам магнатаў Вішнявецкіх, якія хоць і былі сярод лідараў "рэспубліканцаў", але праяўлялі слабую зацікаўленасць ва ўвядзенні гаспадарчага сойміка згодна пастановам "ураўнавання правоў" (каэквацыі).

На грамнічным сойміку 1701 г. высветлілася, што немагчыма выплаціць заробак "рэспубліканскаму" войску ВКЛ, бо да гэтага часу павятовыя паборцы не абіраліся і не збіралі адпаведныя падаткі. Толькі на грамнічным сойміку 9 лютага 1699 г. паборцам была дадзеная адпаведная інструкцыя, але атрымаўся вялікі недабор. Верагодна таму, яны не склалі ніякай справаздачы на наступны год. Зараз было вырашана, каб паборцы збіралі ўсе падаткі ў падвойным памеры, прычым абранне іх адбылося яшчэ на з'ездзе

"рэспубліканцаў" пад Алькенікамі, а зараз толькі падцвярджалася [19, с. 26, 28; 20, арк. 1018адв]. Акрамя таго, было ўстаноўлена, што арэнда ўладанняў епіскапа Тураў прыносіла толькі 100 злотых і таму падатак меў быць не некалькі соцен злотых як раней, а толькі падвойны, гэта значыць 20 злотых. З габрэйскага пагалоўнага на трыбунальскую харугву з Пінскага павета мелі выплаціць 2000 злотых. Прычым габрэі яго павінны былі самі адвозіць да ротмістра трыбунальскай харугвы. Не быў вядомы памер "новага падатку на плебеяў" і таму для яго збора і люстрацыі былі абраны чарнігаўскі стольнік і пінскі гродскі пісар Міхал Казімір Кулікоўскі, а таксама пінскі гараднічы Каспер Парысовіч. Таксама былі абраны суддзі скарбовага суда. Як, і ў 1698 г., было абрана іх чамусці толькі два: пінскі гараднічы Каспер Парысовіч і пінскі падкаморыч Геранім Цехановіч. Яны разам зураднікамі гродскага суда і мелі скласці скарбовы суд. Прычым з-за вялікай колькасці справаў пасяджэнні скарбовага суда павінны ўжо былі пачацца на наступны дзень пасля гаспадарчага сойміка [19, с. 28; 20, арк. 1018–1019адв].

На пінскім гаспадарчым сойміку 1702 г. пад дырэкцыяй віленскага кашталяна Януша Вішнявецкага спачатку былі абраны дэпутаты на Трыбунал ВКЛ, а потым пабарцы гіберны – пінскі гродскі суддзя Ян Казімір Парысовіч і пінскі падчашы Міхал Кердзей. Адміністратарамі чопавага, шэлезнага, шосавага і тытунёвай манаполіі абралі пінскага каморніка Міхала Галаўню і Аляксандра Скірмунта. Таксама быў абраны скарбовы (фіскальны) суд ужо ў значна большай колькасці, у параўнанні з папярэднімі гадамі, 10 суддзяў. З пінскага кагалу ўстанаўліваўся падатак у 2000 злотых. Узнагароджанне пабарцам падаткаў вызначалася па 3 грошы ад кожнага сабранага злотага [19, с. 29; 21, арк. 60–62]. Такім чынам, гаспадарчы соймік дакладна ўсталяваўся ў Пінскім павеце толькі ў пачатку XVIII ст.

Адной з першых узялася за ажыццяўленне каэквацыі наваградская шляхта. На наваградскім сойміку, які адбыўся 26 лістапада 1697 г. пад дырэкцыяй Станіслава Незабітоўскага, былі абраныя скарбовыя суддзі, адміністратары чопавага і шэлезнага, але на наступны дзень было вырашана ўсе пытанні, звязаныя з каэквацыяй, адкласці [22, s. 174]. Станіслаў Маляўскі паведамляў Каралю Станіславу Радзівілу аб гэтым: "соймік пасля ўчыненай справаздачы паноў паслоў адклалі да паслясоймавага або грамнічнага, які наперад будзе назаўтра па [грамнічным – *А.М.*] сойміку абіраць контрагентаў, пабарцаў і суддзяў, на што і пастанову прынялі" [22, s. 183]. Такім чынам, у Наваградку таксама адбылося выдзяленне асобнага сойміка, які прайшоў паспяхова ўжо 4–5 лютага 1698 г., абраўшы на год пабарцаў і скарбовых суддзяў.

Тое ж самае адбылося праз год, 10 лютага 1699 г. Згодна першага пункта пастановы гэтага сойміка было вырашана цалкам падтрымаць Генеральную пастанову шляхты ВКЛ пад Пузевічамі ад 21 лістапада 1698 г., якая ўжо была зацверджана каралём Аўгустам II. Больш таго, наваградская шляхта абяцала абараняць гэтую пастанову не шануючы "здароўя, жыцця і фартуны нашай". Пасля наваградская шляхта пазбавіла выканання абавязкаў харужага шмяльтынскага старосту Міхала Тызенгаўза і абрала на яго месца калішскага падчашага Станіслава Незабітоўскага. Далей у пастанове гэтага сойміка інфармавалася пра праціўнікаў сярод наваградскай шляхты, якія пакінулі соймік. Прычым наваградская шляхта імкнулася пазбегнуць гэтага рознымі спосабамі і яшчэ за некалькі дзён да соймікаў праводзіла шматлікія нарады для захавання адзінства. Ужо нават падчас сойміка сабраўшаяся на замку шляхта двойчы дасылала сваіх прадстаўнікоў да праціўнай групоўкі, запрашаючы на соймік, але тыя не пагадзіліся далучыцца. Наваградскім палкоўнікам быў абраны кухмістр ВКЛ, Крыштаф Камароўскі. Згодна Генеральнай пастанове ВКЛ камісарамі былі абраны наваградскі чашнік Станіслаў Корсак і мсціслаўскі войскі Станіслаў Маляўскі. Пасля, "згодна каэквацыі", адміністратарамі чопавага, шосавага і шэлезнага былі абраны кухмістр ВКЛ, Крыштаф Камароўскі, і наваградскі падчашы, Казімір Маляўскі. Габрэйскае і татарскае пагалоўнае сабіраць былі абраны Станіслаў Пратасовіч, Томаш Мінкоўскі, Станіслаў Палонскі, старадубскі падстолі Юрый Рымша, Міхал Чаркоўскі, Канстанцін Міладоўскі, Лукаш Мінкоўскі, Геранім Рымша і Шымон Зубоўскі. Таксама былі абраны эгзэкутары падаткаў: люблінскі стольнік Павел Звяртоўскі, Тэадор Палонскі, Хаціскі, Крыштаф Чаркоўскі, Ян Улаховіч, Дамінік Магільніцкі, Марцін Зубоўскі, Ян Вірловіч, Юрый Бародзіч, Малушыцкі, Адам Міладоўскі і Багуслаў Ліхадзееўскі. Для разлікаў былых пабарцаў і правядзення люстрацыі былі абраны наваградскі стражнік Уладзіслаў Вольскі, полацкі скарбнік Караль Рудаміна, Адам Корсак і Ян Воўк. У склад скарбовага (фіскальнага) суда было абрана 24 шляхціча. Прычым сярод іх змяшчаліся прадстаўнікі наваградскага гродскага суда: суддзя Гедэон Воўк і пісар Ігнат Пшэрадоўскі. Былі вялікія запазычанасці па выдачы падатку на войска, згодна Генеральнай пастановы ВКЛ 1698 г., і таму даваўся тэрмін у 2 тыдні для іх выдачы, пасля чаго наваградскі палкоўнік мае выдаць адпаведныя ўніверсалы на збор падаткаў павятовымі ротмістрамі з дапамогай эгзэкуцый. Таксама наваградскі палкоўнік і ротмістры мусілі са сваімі атрадамі знішчаць свавольныя жаўнерскія атрады, калі яны з'явяцца ў Наваградскім ваяводстве. Ротмістрамі былі абраны наваградскі падчашы Казімір Маляўскі, наваградскі чашнік Станіслаў Корсак, вендэнскі харужы Леў Троска, мсціслаўскі стольнік Геранім Жаба, наваградскі стражнік Уладзіслаў Вольскі, лідскі падчашы Станіслаў Межэеўскі, браслаўскі падчашы Андрэй Мірскі, брэсцкі чашнік Ян Незабітоўскі, аршанскі падстолі Юрый Пласкавіцкі і Аляксандр Макавецкі. Над татарамі ротмістрам быў прызначаны Аляксандр Бародзіч [12, с. 179–181; 23, k. 1–15]. Гэта быў соймік прыхільнікаў "рэспубліканцаў". З дыярыюша Станіслава Незабітоўскага становіцца вядомым, што адбыўся і альтэрнатыўны наваградскі грамнічны і гаспадарчы соймік прыхільнікаў Сапегаў. На ім у касцёле іезуітаў пад дырэкцыяй парнаўскага падстолія Яна Вяжэйскага абралі дэпутатамі наваградскага мечніка Казіміра

Кандратовіча і Мікалая Вайніловіча і яшчэ абрана там і альтэрнатыўных суддзяў скарбовага суда і паборцаў чопавага і шэлезнага, а таксама іншых падаткаў [12, с. 180; 22, s. 223]. Як бачым, ужо ў 1699 г. наваградскі гаспадарчы соймік добра функцыянаваў і прыняў усе патэбныя рашэнні, якія ўваходзілі ў яго кампетэнцыю, хоць і на двух альтэрнатыўных сойміках. З часам атрымалася дамовіцца і 13-14 сакавіка 1699 г. правесці аб'яднаўчы соймік. На ім пад дырэкцыяй кухмістра ВКЛ, Крыштафа Кандратовіча, прыхільнікі Сапегаў адмовіліся ад сваіх ранейшых пастаноў і прызналі пастановы "рэспубліканскага" грамнічнага і гаспадарчага сойміка. Адзінае, да складу скарбовага суда быў далучаны наваградскі падсудак Уладзіслаў Ян Вольскі. Была прызнана Генеральная пастанова ВКЛ ад 21 снежня 1698 г., за выключэннем палажэнняў аб пакаранні адсутных на паспалітым рушанні [12, с. 182–183; 22, s. 227; 24, k. 1–2].

Наваградская шляхта сабралася на свой соймік 9 лютага 1700 г. Пасяджэнні распачаў наваградскі падсудак Уладзіслаў Вольскі, а соймікавым дырэктарам быў абраны дырэктар грамнічнага сойміка, мсціслаўскі войскі Станіслаў Маляўскі. Як і ў прошлым годдзе, выконваючым абавязкі харужага быў абраны калішскі падчашы Станіслаў Незабітоўскі. Ротмістрамі абралі наваградскага падчашага Казіміра Маляўскага, мсціслаўскага стольніа Гераніма Жабу, наваградскага чашніка Станіслава Корсака, браслаўскага падчашага Андрэя Мірскага, вендэнскага харужага Лева Троску, лідскага падчашага Станіслава Межэеўскага, наваградскага падсудковіча Юзафа Вайніловіча. Ротмістрам над татарамі мусіў быць Станіслаў Вайніловіч. Таксама быў абраны скарбовы суд пры ўрадніках земскага і гродскага суда ў колькасці 16 суддзяў. Паборцамі татарскага і габрэйскага пагалоўнага былі абраны Станіслаў Пратасовіч, Станіслаў Мезін, Міхал Астрэйка, Людвік Малушыцкі, Стэфан Чаркоўскі. Сабраныя грошы яны мелі аддаць ротмістру трыбунальскай пяхоты, Кіяноўскаму [25, k. 1–8; 26, p. 1–3].

Таксама распаўсюдзіўся гаспадарчы соймік і ў іншым павеце гэтага ваяводства – Слонімскім. Вядома пра такі соймік у 1699 г. Таксама, вядома, што на ім адміністратарамі чопавага і шэлезнага, татарскага і габрэйскага пагалоўнага былі абраны віцебскі падстолі Ян Юрэвіч, слонімскі скарбнік Ян Камаровіч і браслаўскі гараднічы Ігнат Талаконскі [27, л. 104–105об]. Аднак, незаўжды слонімскія гаспадарчыя соймікі дзейнічалі згодна ўстаноўленым кампетэнцыям. Слонімская шляхта сабралася на соймік з адкладу 27 лютага 1703 г. на падставе ўніверсала караля. Шляхта звярнула ўвагу, што на мінулым сойміку, 6 лютага 1703 г., былі абраны скарбовыя суддзі (4 суддзі), але не былі абраны адміністратары падатку чопавага і шэлезнага, якіх абралі зараз (слонімскі земскі пісар Міхал Есман і слонімскі гродскі суддзя Андрэй Булгак). Узнагароджанне ім вызначалася згодна пастановы 1701 г. у 6 грошаў ад кожнага сабранага злотага. Таксама зацвердзілі дэпутатаў для збору гіберны – слонімскага войскага Міхала Жабку і рэчыцкага скарбніка Войцаха Бучыньскага. Асабліва падкрэслівалася, што гэта яны маюць збіраць гіберну, а не, насуперак пастановам "каэквацыі", вайскоўцы [28, арк. 116–117адв].

На аршанскім грамнічным сойміку 1701 г. спачатку былі абраны дэпутаты на Трыбунал ВКЛ. Ужо потым на сойміку прыступілі да гаспадарчых спраў. Павятовым палкоўнікам быў абраны Шымон Друцкі Любецкі. Ротмістрамі былі абраны аршанскі скарбнік Самуэль Цеханавецкі, Казімір Стэткевіч, смаленскі стольнік Мікалай Шэмет і віцебскі падчашы Францішак Лукомскі. Было абрана 8 скарбовых суддзяў, якія разам зураднікамі земскага і гродскага судоў мелі сфарміраваць склад скарбовага суда. Паборцамі гіберны, падымнага, габрэйскага і татарскага пагалоўнага і тытунёвай манаполіі зацвердзілі тых, што былі абраны на з'ездзе "рэспубліканцаў" у Алькеніках. Таксама ім пакідаўся збор шосавага. У той жа час, адміністратарам чопавага і шэлезнага за 40 тысяч злотых стаў троцкі кашталян Міхал Казімір Коцел. Аршанская шляхта скардзілася, што шмат розных уладанняў не выдавалі падаткі на заробак войску і таму патрабавалася, каб аршанскі палкоўнік як мага хутчэй правёў эгзэкуцыі, згодна рашэнням скарбовага суда па атрыманні запазычанасці гэтых падаткаў [29, арк. 120–123адв; 30, с. 16].

На наступным аршанскім гаспадарчым сойміку 1702 г. дайшло да канфлікту падчас выбару павятовага палкоўніка [29, арк. 880–882адв.]. Згодна адной з пратэстацый, Казімір Стэткевіч і яго прыхільнікі (дырэктар гаспадарчага сойміка Стэфан Кіркор, Міхал Баратыньскі, Чарэйскія і Бяліцкія) перашкаджалі законнаму правядзенню аршанскага грамнічнага сойміка 1702 г. На ім, невядома з якіх прычын, абралі 2 соймікавых дырэктары – брэсцкага ваяводзіча Яна Курча і Яна Кіркора. Пад іх соймікавай дырэкцыяй на двух сойміках было абрана 4 дэпутаты на Трыбунал ВКЛ. На першым – Шымона Друцкага Любецкага і аршанскага лоўчага Стэфана Александровіча, а на другім – Станіслава Катоўскага і Антонія Галінскага. Ужо 7 лютага 1702 г. на гаспадарчым сойміку быў абраны трэці дырэктар, Стэфан Кіркор. На гэтым сойміку Стэткевіч і яго прыхільнікі не дапускалі заслужаную шляхту да выбара скарбовымі суддзямі, паборцамі падаткаў і ротмістрамі. Больш таго, Стэткевіч і яго прыхільнікі былі абвінавачаны ў спрыянні стольнікаўне ВКЛ, Ізабэле Сапеге[1]. Як бачым, з гэтых пратэстацый, аршанскі гаспадарчы соймік 1702 г. адбыўся на другі дзень пасля грамнічнага. Соймікавым дырэктарам на ім быў абраны не адзін з двух соймікавых дырэктароў альтэрнатыўных аршанскіх грамнічных соймікаў, а трэці соймікавы дырэктар. На гаспадарчым сойміку разгарнулася барацьба паміж двума шляхецкімі групоўкамі за выбар павятовым

[1] Напэўна звязана з тым, што Ізабэла з Палубінскіх Сапега ў гэты час аб'явіла аб сваіх правах на ўладанні, якія вывіла з пад улады свайго мужа стольніка ВКЛ Юрыя Станіслава Сапегі, што вызвалілa іх ад захопу "рэспубліканцамі". – [30, с. 16].

палкоўнікам, ротмістрамі, паборцамі. Гэта сведчыць пра папулярнасць гэтых павятовых функцый сярод мясцовай шляхты. Адначасова бачна, што палітычныя падзелы сярод мясцовай шляхты на дзве групоўкі не перашкодзілі правядзенню гаспадарчага сойміка, што, напэўна, было выклікана разуменнем мясцовай шляхтай важнасці прымаемых гэтым соймікам пастаноў для функцыянавання скарбова-вайсковай сістэмы ў павеце і забеспячэння бяспекі ў час супрацьстаяння з прыхільнікамі Сапегаў.

Мсціслаўскі грамнічны соймік 1701 г. не толькі абраў дэпутатаў, але і разглядзеў пытанні, якія тычыліся кампетэнцыі гаспадарчага сойміка. Былі пацверджаны абраныя на прошлых сойміках ротмістры: мсціслаўскі падкаморы Вінцэнт Валовіч і мазырскі скарбнік і мсціслаўскі гродскі пісар Францішак Война Ясянецкі. Да іх яшчэ быў абраны ротмістрам мсіслаўскі крайчы Казімір Маскевіч. Камісарам быў абраны мсціслаўскі гараднічы і мсціслаўскі падстароста Стэфан Галынскі. Пасля на сойміку была прачытана пастанова, якую прынялі пад Алькенікамі. Патрабавалася выплаціць даўгі ў падатках, што збіраліся на паспалітае рушанне. Устанаўліваліся падаткі быўшай пад Алькенікамі харугве пад кіраўніцтвам Марціна Валовіча, а таксама для забітых і параненых у гэтай бітве. Пацвярджаліся адміністратары чопавага і шэлезнага, а таксама паборцы гіберны і іншых падаткаў, што былі абраны на сойміку 3 студзеня 1701 г., пасля вяртання мсціслаўскай шляхты з-пад Алькенік. Гэтымі зборшчыкамі былі: па даўгам на падаткі на паспалітае рушанне – полацкі мечны Глеб Казанскі, оўруцкі падстолі Юзаф Сурын і харужы харугвы Мсціслаўскага ваяводства, Антоній Панятоўскі; гіберны – мсціслаўскі канюшы Уладзіслаў Панятоўскі і Ян Асмалоўскі; чопавага, шэлезнага і шосавага – мсціслаўскі гараднічы і мсціслаўскі падстароста Стэфан Галынскі. Паборцам гіберны дазвалялася ўзяць вызначанае законам узнагароджанне. Калі хто не выдаў устаноўленых падаткаў, то праз 3 тыдні павятовыя ротмістры мелі правесці эгзэкуцыю. Быў абраны скарбовы суд у колькасці 8 суддзяў [30, с. 16–17; 31, арк. 85–89адв.].

Усталяваўся гаспадарчы соймік і на паўднёвым усходзе ВКЛ, хоць аб гэтым маецца мала крыніц. Мазырская шляхта сабралася на грамнічны соймік 1703 г., дзе абрала 6 скарбовых суддзяў. Аднак, як не было земскага суда, то да ліку скарбовых суддзяў абралі яшчэ смаленскага мечніка Міхала Ясянецкага [32, арк. 411]. Яшчэ ў 1698 г. гаспадарчы соймік пачаў дзейнічаць і ў Рэчыцкім павеце [9, с. 94; 12, с. 190]. У 1706 г. спачатку адбыўся 7 лютага 1706 г. рэчыцкі элекцыйны соймік па выбару падкаморыя. Цікава, што ўжо на ім былі абраны і дэпутаты Трыбунала ВКЛ. Аналізаваўшы дакументы гэтага сойміка, Робертас Юргайціс лічыць гэта за памылку пісара і дэпутаты былі абраны 8 лютага 1706 г. на грамнічным сойміку. Ужо потым былі абраны паборцы гіберны Уланкоўскі і Вербша, а таксама чопавага і шэлезнага – Кельчэўскі і Андрэй Белы [33, с. 287–291; 34, арк. 239; 35, арк. 585–586].

**Высновы.** Такім чынам, сваіму з'яўленню гаспадарчы соймік абавязаны руху "рэспубліканцаў", якія адным з пунктаў сваёй праграмы "ўраўнавання правоў" (каэквацыі) бачыў увядзення скарбовых судоў і перанясенне фінансавання войска ў паветы. Часам правядзення гаспадарчага сойміка становіцца наступны дзень пасля грамнічнага сойміка. Прычынай вызначэння такога часу быў сталы тэрмін правядзення апошняга і адсутнасць неабходнасці склікання гаспадарчага сойміка каралеўскім універсалам. Вельмі часта гэтыя соймікі выступалі пад адной назвай "грамнічны" і нават адбываліся ў адзін дзень. Ужо ў перыяд 1697 – 1717 гг. гаспадарчы соймік цалкам адлучыўся ад грамнічнага, хоць у нека-торых паветах і захоўваў агульную соймікавую дакументацыю ў выглядзе соймікавай пастановы і нават аднаго соймікавага дырэктара. Звычайна ў 1697 – 1717 гг. на гаспадарчым сойміку адбываўся выбар: паборцаў чопавага і шэлезнага, гіберны, габрэйскага і татарскага пагалоўнага, тытунёвай манаполіі, камісараў па зборы падаткаў, а таксама павятовых палкоўніка і ротмістраў, складу скарбовага (фіскальнага) суда. У сітуацыі Паўночнай вайны і вайны паміж "рэспубліканцамі" і Сапегамі значныя шкоды мелі ўладанні ў павеце і таму частым была практыка выбара люстратараў, якія мелі складаць новы тарыф, каб колькасць збіраемых падаткаў адпавядала рэальнаму стану. Увядзенне асобнага гаспадарчага сойміка было рацыянальным крокам, паколькі давала магчымасць у выпадку зрыву грамнічнага сойміка разглядзець скарбовыя і іншыя эканамічныя пытанні, а таксама праз абранне палкоўніка і ротмістраў пастарацца аб выкананне судовых дэкрэтаў і грамадскай бяспекі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Радаман, А. Соймік / А. Радаман // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. С. 615 – 617.
2. Рахуба, А. Вялікае княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай (1569 – 1763) / А. Рахуба. – Мінск, 2008.
3. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka. – F 17. B. 177.
4. Volumina legum.T. V. – Petersburg, 1860.
5. Volumina legum.T. VI. – Petersburg, 1860.
6. Sliesoriūnas, G. Sejm Niemy a rewizja reform ustrojowych, zainspirowanych przez litewskich republikantów na przełomie XVII i XVIII w. / G. Sliesoriūnas // Sejm Niemy. Między mitem a reformą państwa / red. M. Zwierzykowski. – Warszawa, 2019. – S. 189 – 201.

7. Zakrzewski, A. Sejmiki Wielkiego Księstwa Lit. XVI-XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki / A. Zakrzewski. – Warszawa, 2000.
8. Biblioteka Czartoryskich. – Rkps. 192.
9. Віцько, Д. Галоўны Трыбунал ВКЛ 1698 г.: судовая расправа над Сапегамі / Д. Віцько // Архэ. – 2016. – № 3. – С. 84 – 139.
10. Biblioteka Jagiellońska. – Sygn. 6357.
11. Vilniaus universiteto biblioteka (далей VUB). – F. 7. Sign. 32/13909.
12. Віцько, Д. Дэпутацкія соймікі ВКЛ 1699 г. / Д. Віцько // Архэ. 2015. – № 12. – С. 164 – 193.
13. VUB. – F. 7. Sign. 4/6145.
14. Віцько, Д. Супрацьстаянне палітычных груповак у Гарадзенскім павеце ў 1696 – 1700 гг. / Д. Віцько // Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XVI – XX ст. – С. 204 – 223.
15. Мацук, А. Полацкае ваяводства ў XVIII ст.: ваявода, шляхецкая эліта, соймікі / А. Мацук. – Мінск, 2014.
16. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей НГАБ). – Ф. 1705. Воп. 1. Спр. 27.
17. Акты Виленской археографической комиссии. Т. 4. Акты Брестского гродского суда. – Вильно, 1870.
18. НГАБ. – Ф. 1733. Воп. 1. Спр. 14.
19. Віцько, Д. Пінскі соймік у канцы XVII – пачатку XVIII ст.: функцыянаванне і палітычнае жыццё / Д. Віцько // Беларускі гістарычны часопіс. 2011. № 2. – С. 22 – 30.
20. НГАБ. – Ф. 1733. Воп. 1. Спр. 15.
21. НГАБ. – Ф. 1733. Воп. 1. Спр. 16.
22. Niezabitowski, S. Dzienniki, 1695 – 1700 / S. Niezabitowski. – Poznań, 1998.
23. Archiwum Główne Akt Dawnych (далей AGAD). – AR. – Dz. II. Sygn. 1869.
24. AGAD. – AR. – Dz. II. Sygn. 1870.
25. AGAD. – AR. – Dz. II. Sygn. 1882.
26. VUB. – F. 13. Sign. 178.
27. Российский государственный архив древних актов. – Ф. 356. Д. 34.
28. НГАБ. – Ф. 1737. Воп. 1. Спр. 26.
29. НГАБ. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 2.
30. Віцько, Д. Паўстанне на ўсходзе Беларусі ў 1701–1702 гг. / Д. Віцько // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 4. – С. 15 – 21.
31. НГАБ. – Ф. 1729. Воп. 1. Спр. 5.
32. НГАБ. – Ф. 1728. Воп. 1. Спр. 4.
33. Юргайтис, Р. Как голосовала шляхта Речицкого повета 7 февраля 1706 г., выбирая депутатов Главного Литовского Трибунала / Р. Юргайтис // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у стагоддзях. – Мінск, 2008. – С. 285 – 295.
34. НГАБ. – Ф. 1736. Воп. 1. Спр. 1.
35. НГАБ. – Ф. 1736. Воп. 1. Спр. 3.

*Паступіў 13.12.2019*

**THE DEVELOPMENT OF GENTRY SELF-GOVERNMENT AND THE FORMATION OF THE ECONOMIC SEIJMIK IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE LATE 17TH – EARLY 18TH CENTURY**

***A. MACUK***

*On the basis of new handwritten documents, the author investigates the development of the gentry self-government and the formation of the economic sejmik in the late 17th - early 18th century in various povets of the Grand Duchy of Lithuania. It was possible to establish that the economic sejmik owed its appearance to the "Republicans" movement, which saw as one of the points of its "equalization of rights" (koekwacja) program introducing of the skarb courts and transferring of the army funding in povets. On the economic seijmik should have elected: poborts (collectors) of czopove and sheleznoe, hibernoe, Jewish and Tatar pogolovnoe (capitation), tobacco monopoly, tax collection commissioners, as well as povet colonel and rittmeisters, composition of a skarb (fiscal) court.*

***Keywords:*** *economic sejmik, koekwacja, republicans, gentry, nobleman, collectors, skarb court, parliamentarism.*